на вылатна было 7,4, у той час сярод некурачых студэнтаў гэта лічба складала 14,8%.

Сярэдняя працягласць аднаго выпадка захворвання ў курачых была 4,5, а ў некурачых – 4,3 дня. Звяртаемасць па хваробе ў курачых студэнтаў складала 107,4, а ў некурачых – 91,8%. Сярэдняе знаходжанне хварэўшых студэнтаў не дзведні на працягу вучэбнага года, сярод курачых раўнялася 8,8, а некурачых – 7,9 дням. Як відаць, курэнне тытуню аказвае адмоўны ўплыў на здароўе і паспяховасць студэнтаў.

## РАСПАЎСЮДЖАНАСЦЬ ШКОДНЫХ ЗВЫЧАК СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Я.Л.Маркоцкі
С.І.Суднік

Узрастаючае прылучэнне насельніцтва многіх краін да тытунекурэння разглядаецца вучонымі і перадавой грамадскасцю як нацыянальнае бедства. Гэты масавы недахоп называюць хваробай цывілізацыі, набыўшы цяпер не толькі медыцынскі, але і сацыяльны аспект. Сягоння ў многіх краінах курыць больш трэці мужчынскага насельніцтва ва ўзросце старэй 15 гадоў і каля чвэрці жаночага.

У цяперашні час няма даных аб распаўсюджанасці курэння сярод розных сацыяльных і ўзрасных груп насельніцтва Рэспублікі Беларусь. На працягу многіх гадоў намі вывучалася распаўсюджанасць курэння тытуню сярод студэнтаў, рабочых, алкаголікаў, гэта значыць, мужчын і жанчын, знаходзячыхся ў рэпрадуктыўным узросце.

Намі абследавана 466 студэнтаў. Сярод іх было 175(37,5%) юнакоў і 291(62,5%) дзяўчат. Сярод юнакоў 109 (62,3%) чалавек і дзяўчат 58 (20%) – курылі. Сярэдні ўзрост курачых складаў 20,4, а сярэдні ўзрост ад пачатку курэння быў 15,8 гадоў. На працягу сутак адным курцом выкурвалася ў сярэднім 12 цыгарэт.

Абследавана 671 рабочы мужчынскага полу 407 завода г.Мінска. Сярод іх – 344 (51,3%) курылі. Яны выкурвалі ў сярэднім 13,4±0,36 цыгарэты ў суткі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У радзільным доме № I г.Мінска абследаваны маці і бацька 3698 нованароджаных. Курачых бацькоў аказалася 1926 чалавек, што складае 51,1%, а сярод маці толькі - 137 асоб, гэта 3,7%. Хаця да цяжарнасці працэнт курачых жанчын быў значна вышэй. Тут можна падкрэсліць на станоўчую ролю жаночых кансультацый і санітарнай асветы па прафілактыцы шкодных звычак.

Абследавана 215 хворых хранічным алкагалізмам і 215 здаровых мужчын такога ўзросту. Сярод алкаголікаў 186 (86,5%) і здаровых 102 (47,4%) курылі. Распаўсюджанасць курэння сярод хранічных алкаголікаў амаль у два разы вышэй, чым сярод здаровых мужчын. Відаць узаемазалежнасць гэтых наркотыкаў.

Як відаць з нашых даследаванняў, распаўсюджанасць курэння сярод маладога насельніцтва Рэспублікі Беларусь складае у мужчын больш 50 і жанчын - 20%.

## НЕМЕДЫКАМЕНТОЗНЫЯ МЕТАДЫ УЗДЗЕЯННЯ НА АРГАНІЗМ СТУДЭНТАЎ

Ж.В.Лявонава

У апошні час з'явілася вельмі многа захворванняў алергічнага характару. Вучоныя медыкі лічаць, што чалавек алергізаваны медыкаментамі, з'явіўся новы тэрмін "лекавы" чалавек. Ужыванне вялікага мноства медыкаментаў прыводзіць да алергізацыі насельніцтва. Як папярэдзіць рад захворванняў, як выправіць функцыянальныя адхіленні некаторых сістэм у арганізме чалавека без ужывання медыкаментаў. Як павысіць працаздольнасць і зняць стамленне. Ёсць рад метадаў уздзеяння на біялагічна актыўныя кропкі (акупунктура):

- ужыванне элементаў усходняй гімнастыкі (цігун, хатха-йога);
- псіхалагічная самаабароненасць.

Мы ужывалі гэтыя немедыкаментозныя метады на студэнтах МІК. На базе лабараторыі рэкрэалогіі.

Была узята група студэнтаў (121 чалавек) розных спецыяльнасцей, якія прымянілі кропачны масаж біялагічных кропак па